# З ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ КІРМАШОВАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

*Г.В. Іванова*
*Віцебск, ВДУ імя П.М.Машэрава*

У сапраўдны момант народныя святы сталі сістэмай прадстаўнічых формаў і ў значнай ступені адышлі ад традыцыйна-народнага гульнявога пачатку як гэта было раней. Аналізуючы святы мінулых пакаленняў, можна ўбачыць, што галоўная задача арганізатара была арыентацыя людзей на іх асабісты ўдзел у свяце, дзе яны ад сузірання пераходзілі да канкрэтных дзеянняў. Мэтай працы з'яўляецца вывучэнне і аналіз супярэчнасцяў, якія ўзнікаюць паміж традыцыйна-гульнявым пачаткам народных святаў і іх правядзеннем у сучасны момант.

**Матэрыял і метады.** Метадалагічнай асновай артыкула з'яўляюцца працы айчынных гісторыкаў і этнографаў Гуда П.А., Гуд Н.І., Барышэва Г.І, Адашчыка Ф.І, Мерзляка В.І, а таксама даследаванні ў галіне беларускага фальклору Салавей Л.М., Літвіновіч А.Ф. Выкарыстаны метады аналізу, супастаўлення, сістэматызацыі, абагульненне.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У XV ст. на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца паняцце «кірмаш», якое характарызуе з’яву эканамічнага і духоўнага жыцця народа. У многіх гарадах рынак меў сваё прасторавае і каструктыўнае вырашэнне, мясцовыя дэталёвыя адрозненні. Напрыклад, у Магілёве ён быў плошчай больш за 2 гектары, дзе размяшчаліся ларкі, лаўкі, склады. Разам з гандлёвымі пабудовамі пачалі ўзнікаць гасціныя двары, дзе пражывалі і гандлявалі купцы. Цэнтральным пунктам гасцінага двара з’яўляўся гасціны дом, ён уключаў у сябе пакоі, каморы, сенцы і інш [1].

У кірмашовым гандлі ўдзельнічалі сяляне, мяшчане, купецтва, дваране, а таксама невялікая колькасць чужаземцаў. Зэльвенскі штогодні кірмаш, вядомы з пачатку XVIII ст., заставаўся буйнейшым на Беларусі, ён меў прамысловую арыентацыю: тканіна, бакалея, галантарэя, посуд, футра, жалезныя вырабы.

У другой палове XIX ст. адбываюцца істотныя змены ў кірмашовай культуры беларусаў, якія былі выкліканы далейшым станаўленнем капіталізму. Такім чынам, беларускі кірмаш феадальнай і капіталістычнай эпох у працэсе эвалюцыі прымаў разнастайныя ўвасабленні. Аднак, штогоднія святочныя таргі мелі падобную структуру, іх можна падзяліць на тры жанравыя разнавіднасці:

– гандлёва-гульнёвыя дзеянні;
– кірмашовы тэатр;
– пацехі і забавы.

Разгледзім, як жа развіваўся кожны з відаў святочага гандлю.

*Гандлёва-гульнёвыя дзеянні.* Самай старажытнай гандлёвай дзеяй з’яўляецца акт куплі-продажу, гэта свайго роду спаборніцтва паміж прадаўцом і пакупніком, неабходна было прадаць даражэй і купіць танней. Каб выгадна рэалізаваць тавар, кожны прадавец удзяляў увагу славеснай рэкламе, расхвальваў свой тавар. Вось чаму ў нейкай меры кірмаш прыцягваў пакупнікоў не толькі за патрэбай, але і як своеасаблівай гульнёвай формай здзелкі, у якой прадавец або зніжаў цану за тавар, альбо прадаваў яго за пачаткова названы кошт [1]. Крыху пазней з’яўляецца новы від гандлёвага дзеяння – аўкцыён (прадажа з публічных таргоў). Аўкцыён рэалізоўваў гульнёвы прынцып – конкурс, тым самым прыцягваў большую колькасць людзей.

У сярэдзіне XIX ст. узнікае новая форма гандлёвых дзеянняў– прамысловыя і сельскагаспадарчыя выставы. Роля выстаў была рознай: мясцовыя гандлёвыя выставы тэкстыльнай прадукцыі, паказ тэхнічных дасягненняў і г.д.. У 1850 г. першая выстава на Беларусі мела мэту папулярызацыі дасягненняў памешчыцкіх гаспадарак.

Памешчыкі прадставілі каля 1432 розных экспанатаў (лён, каноплі, хлеб, садавіну і гародніну, жывёлу, скуры, сукно, гліняны посуд, лыжкі і інш.) [2].

Галоўную ролю на кірмашовых выставах адыгрывалі атракцыёны, якія мелі мэту забаўляльнага мерапрыемства. Напрыклад, у мястэчку Горкі Магілёўскай губерніі адбывалася народнае гулянне, дзе выступаў хор. Крыху пазней, знова з'яўляецца новая разнавіднасць гандлёвага дзеяння гэта– латарэі. Мэта латарэі складалася з выпуска і продажы латарэйных білетаў з дальнейшым іх розыгрышам сярод насельніцтва. Спачатку розыгрышы былі дабрачыннымі, але далей яны трапілі у рукі махляроў, якія рабілі «бяспройгрышныя латарэі» і абдурвалі даверлівых пакупнікоў. Напрыклад, для «заману» побач хадзілі некалькі чалавек, трымаючы ў руках дыван або самавар і на пытанні прастадушных тлумачылі, што яны хвіліну таму выйгралі гэтыя рэчы. На самой справе ў лік выйграшаў не ўваходзілі гэтыя прадметы, а той, хто набыў білет, выйграваў, напрыклад, чайную лыжку.

Гэтыя фінансавыя дзеянні мелі тэрытарыяльная адрозненне. Так, у Пінску была папулярна рыбная латарэя, дзе рыбу прадавалі загорнутай ў паперу. Калі угадаешь, дзе галава у рыбы– бярэш дарма, а калі не – плаціш невялікую суму грошай гаспадару. У Мінску была латарэя садавіны, гэта калі побач з прылаўкам фруктаў вісіць паперка з лічбамі (пад кожнай лічбай – прыз). Ты круціш барабан і выцягваешь паперку с нумарам, напрыклад, лічба 3 – «апельсін». Вам і дае гаспадар ваш прыз [2].

У Браславе, каб хутка рэалізаваць тавар, на атракцыёне ставілі драўляныя бочкі з вадой і рыбай. Галоўная задача пакупніка з маскай на твары напрацягу 15 секунд рукамі лавіць рыбу. Калі злавіў за абумоўлены час, яна твая.

Такім чынам, гандлёва-гульнёвыя дзеянні беларускіх кірмашоў мелі розныя ўвасабленні і відазмяненні, якія арганічна спалучалі ў сваёй структуры і працоўныя дасягнення, і забаўляльную праграму для людзей.

*Кірмашовы тэатр.* Ў Беларусі на штагодніх святочных таргах існавал комплекс тэатральных дзеянняў. Дзеі адбываліся як у час, так і пасля гандлю. Другімі словамі, святочныя таргі цесна ўзаемадзейнічалі з духовная культурай народа. Неадменную частку кірмашовых забаў складала творчасць скамарохаў. Беларускія скамарохі падзяляліся на вандроўных і асёлых. Каб матэрыяльна забеспечыць сваю сям'ю, скамарохі дадткова займаліся рамяством ці земляробствам [3].

Крыху пазней абрадава-гульнёвы тэатр як форма мастацтва скамарохаў змяняецца тэатральнымі відовішчамі, дзе з'яўляюцца акцёры і камедыянты. Аднак на Беларусі вандроўныя скамарохі застаюцца і складаюць канкурэнцыю артыстам. Любімае прадстаўленне народа была мядзведжа забава. Мядзведзь з'яўляўся сімвалам шчодрасці і забавы, таму скамарохі любілі апранаць звярыныя шкуры. Лічылася, што, калі жанчына патанчыць на масленіцу з мядзведзем, у яе абавязкова будуць дзеці.

Можна зрабіць вывад, што кожны скамарох меў сваю прафесію: акрабата, музыканта, фокусніка, павадыра і г.д.., яны рабілі прадстаўлення, якія ўключалі ў сябе абрадавыя дзеянні, сцэнкі, пародыі на рэлігійныя рытуалы або народныя традыцыі (вяселле або пахаванне).

З XVI ст. у Беларусі з'яўляецца знакаміты тэатр лялек – батлейка. З'яўленне батлейкі звязана з рэлігійным святам – нараджэннем Хрыста, святам каляд. Батлейку паказвалі ў час гарадскіх і вясковых святаў. Сюжэт быў розны: жартоўныя і сатырычныя песні, фальклорныя сцэнкі, біблейскія сюжэты. У пачатку XX ст. (на Случчыне) з'яўляецца новы від батлейкі – «жывая батлейка», калі батлеечныя сцэны гулялі людзі. Паступова батлейка страціла свой рэлігёзны змест і перашла ў разрад кірмашовых забаў.

На беларускіх кірмашах існаваў яшчэ адзін папулярны від тэатру – фрай. Гэта калі на кірмашовай плошчы на зямлі акрэслівалі круг, і ў гэтым крузе артысты паказвалі

цыркавыя паказы, пелі ці танцавалі. Пасля выступлення артысты хадзілі па крузе і ад гледачоў збіралі грошы, або прадукты за прагляд [3].

Такім чынам, кірмашовы тэатр карыстаўся сярод народа вялікай папулярнасцю, таму што даваў магчымасць гледачу не толькі атрымаць асалоду ад убачанага, але і актыўна паўдзельнічаць у гэтай дзейнасці. Прадстаўлення былі простыя і зразумелыя для людзей, яны адлюстроўвалі іх думкі, надзеі і жаданні.

*Пацехі і забавы.* Адметная рысай беларускіх кірмашоў была танцавальная забава. Напрыклад, у Мінскай губерніі на кірмашы з'яўляюцца музыкі са скрыпкамі, гармоніямі, пад музыку якіх моладзь скача мясцовыя танцы (крутуху, бычка, барыню, лявоніху, кадрылю). На асобных кірмашах танцы насілі характар спаборніцтва, дзе ўдзельнікі імкнуліся заваяваць найбольшыя сімпатыі гледачоў.

Напрыклад, у Бабруйскім павеце адбываўся конкурс фальклорна-інструментальных ансамбляў. На кірмаш збіраліся музыканты з усіх вакольных вёсак, дамаўляліся аб гульні. Хто ў гэтым годзе лепшы на кірмашы, таму і перавага ігры на вяселлях усёй акругі. Яны ігралі ўсе разам адначасова ў розных месцах. Дзе больш народу скача, спявае – той і перамог [1].

У пачатку XX ст. на кірмашах Беларусі з'яўляюцца конныя гульні. Напрыклад, у Віцебскай губерніі выязджалі навыперадкі хлопец з паненкай, дзве пары. Той, хто прыязджаў да загаддзя вызначанай мэты, забіраў паненку суперніка, а потым за яе патрабаваў выкуп.

На Міёршчыне карысталася папулярнасцю перацягванне канату. Удзельнікі каманд прывязваліся вяроўкамі за пояс і да каната, цягнулі канат праз невялікі ручэй, і тыя, каго супернік перацягваў, валіліся ў ваду.

**Заключэнне.** Такім чынам, мы прыходзім да высновы, што такія розныя спаборніцтва надавалі кірмашам мясцовы каларыт і своеасаблівасць, творчыя конкурсы ўзнікалі стыхійна, мелі неафіцыйны характар. Але гэтая цікавая форма праявы беларускай творчасці далучала да ўдзелу шырокія слаі насельніцтва…

Крочыць па беларускай зямлі штогодні святочны кірмаш, захоўваючы і развіваючы традыцыі продкаў, крочыць, каб прынесці у кожную хату матэрыяльная і духоўнае багацце, створанае рукамі і розумам чалавека.

1. Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

2. Гарнак, В.У. Фальклрарысты Віцебшчыны першай паловы XIX стагоддзя / В.У. Гарнак // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія : зборнік навуковых артыкулаў. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – С. 331–332. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/26285 (дата звароту: 25.01.2024).

3. Півавар, М.В. Гісторыка-культурная і прыродная спадчына ў наваколлях Віцебска / М.В. Півавар // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2003. – N 1(27). – С. 3–11. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/8911 (дата звароту: 25.01.2024).

## РОЛЬ ФИЛОСОФСКОГО КОНСУЛЬТИРОВАНИЯ В ТЕРАПИИ ЭКЗИСТЕНЦИАЛЬНЫХ ПРОБЛЕМ

*Ю.А. Коломийцева*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Философское консультирование как одна из разновидностей психотерапевтической практики в последние годы набирает все большую популярность. Многие учебные заведения предлагают для психологов переподготовку и повышение квалификации в области философского консультирования. Особое внимание на таких курсах уделяется практикам саморефлексии и личностной трансформации, а также философским основаниям терапевтической деятельности.

На сегодняшний день обществу приходится сталкиваться с множеством глобальных проблем, таких как пандемия, миграция, военные действия, «мы живем в таком